УДК 94(476)(043.2)
ББК 63.3(4 БеИ)
Г 51

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ імя М. Танка

Рэдакцыйная калегія: У.В. Тугай (галоўны рэдактар), С.П. Барадзін, Дз.У. Дубінін, А.П. Жытко, У.У Куніцкі, А.І. Малюгін, А.М. Люты, А.Ф. Рацько, В.М. Фамін, А.А. Цобкало, Л.Л. Шкуцько

Рэцэнзенты: У.М. Міхнюк, доктар гістарычных навук, прафесар
А.А. Яноўскі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Г 51 Сучасныя праблемы гістарыяграфіі гісторыі: Матэрыялы Рэсп. навук.-практ. Канф., 28 лістапада 2003 г.; Рэдкал.: У.В. Тугай (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БДПУ, 2003.-с. 252.

Асвятляюцца актуальныя пытанні гістарыяграфіі гісторыі Беларусі ад старажытнасці да нашых дзен, гістарыяграфія гісторыі славянскіх народаў а таксама гістарыяграфія ўсеагульнай гісторыі. Прызначаецца навукоўцам і выкладчыкам вышэйшых навучальных устаноў.

УДК 94(476)(043.2)
ББК 63.3(4 БеИ)

ISBN 985-435-155-6 (ч. 1)

© БДПУ імя М. Танка, 2003

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка"

СУЧАСНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ГІСТАРЫЯГРАФІІ ГІСТОРЫІ

Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі
28 лістапада 2003 года

У 3-х частках

Частка 1

Мінск
2003

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Литература:

1. Михневич Л.М. Торговля в Белоруссии. 1900-1970. Мн., 1973.
2. Экономика Белоруссии в эпоху империализма (1900-1917). Мн.,1963.
3. Дихтяр Г.А. Внутренняя торговля в дореволюционной России. М., 1960.
4. Бейлькин Х.Ю. Сельскохозяйственный рынок Белоруссии. 1861-1914 гг. Мн., 1987.
5. Швед В.В. Торговля Беларуси в период кризиса феодализма (1830-1850-е гг.). Гродно, 1995.
6. Карпіевіч В.А. Развіццё гандлю ў Беларусі (1861-1900). Аўтарэферат канд. гіст. навук. Мн., 2003.
7. Шаўчэня М.М. Развіццё гандлю ў Беларусі (канец XVIII – першая трэць XIX ст.). Аўтарэферат канд. гіст. навук. Гродна, 2003.

СЯЛЯНСКАЯ РЭФОРМА 1861 Г. У БЕЛАРУСІ: НЕКАТОРЫЯ ПЫТАННІ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

А.Ф. Рацько
г. Мінск

Сялянская рэформа 1861 г. унесла глыбокія сацыяльныя, эканамічныя і палітычныя змены ў жыццё беларускага народа і таму стала аб'ектам спецыяльнага вывучэння беларускіх гісторыкаў. Адным з першых даследчыкаў гісторыі Беларусі эпохі капіталізму, які закрануў пытанне аб адмене прыгону, быў А.М. Ігнатоўскі. У сваіх працах [1] А.М. Ігнатоўскі асноўную ўвагу звяртае на падзеі, якія мелі месца пасля рэформы: сялянскі рух, паўстанне 1863 г., развіццё эканомікі ў паслярэформенны перыяд і г.д. Даследчык памылкова лічыў паўстане 1863 г. у Беларусі сялянскім.

М.В. Доўнар-Запольскі на падставе аналізу шматлікіх крыніц і літаратуры вывучаў умовы, асаблівасці і наступствы адмены прыгону ў Беларусі. Даследуючы развіццё парэформенай гаспадаркі, гісторык не заўважае развіцця капіталізму, дыферэнцыяцыі сялянскага саслоўя. Спрэчным з'яўляецца стаўленне М.В. Доўнар-Запольскага да асобы віленскага генерал-губернатара М. Мураўёва і яго дзейнасці ў час падаўлення паўстання 1863 г. [2].

У 20-30-я гады XX ст. з'яўляюцца працы М.В. Мялешкі, А. Шлюбскага, Д. Жарыкава [3], у якіх робіцца спроба ахарактарызаваць стан прыгоннай гаспадаркі Беларусі напярэдадні рэформы 1861 г., што з'яўляецца вельмі важным пры высвятленні пытання аб прычынах таго, чаму менавіта беларуска-літоўскія памешчыкі сталі "ініцыятарамі" адмены прыгоннага права ў Расіі. Аўтары прыходзяць да высновы, што ў сельскай гаспадарцы Беларусі першай паловы XIX ст. адбывалася эвалюцыя ад феадальнага спосабу вытворчасці да капіталістычнага. Аднак атрымаць адказ на пытанне аб тым, чаму з прашэннем да Аляксандра II аб вызваленні сялян ад прыгону выступілі памешчыкі заходнебеларускіх зямель, у той час як іх сабраты ва ўсходніх і цэнтральных землях маўчалі, – складана.

У манаграфіях К.І. Кернажыцкага і У.І. Пічэты [4] даследуецца пытанне аб стане эканамічнага развіцця беларускіх зямель напярэдадні аграрнай рэформы 1861 г. Аўтары, падсумоўваючы даследаванні па сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі ў XVIII – першай палове XIX ст., імкнуліся вырашыць важную праблему гістарычнай навукі – генезіс капіталізму і яго асаблівасці ў нашым рэгіёне.

І. Лочмель у артыкуле "Адмена прыгоннага права на Беларусі ў 1861 г." звяртае ўвагу на тое, што беларуска-літоўскія памешчыкі першымі выказаліся за адмену прыгоннага права. Галоўнай прычынай гэтага ён лічыць толькі "асабліва шырокі размах барацьбы сялян супроць памешчыкаў" [5]. І. Лочмель падрабязна апісвае Маніфест 19 лютага 1861 г., але нічога не гаворыць пра асобныя "Палажэнні" для розных губерняў нашага краю.

У пасляваенныя гады XX ст. з'яўляюцца першыя даследаванні, прысвечаныя пытанням адмены прыгоннага права ў Беларусі ў межах той ці іншай губерні [6], змест якіх у асноўным прысвечаны падрыхтоўцы рэформы 1861 г., а таксама грамадскаму і сялянскаму рухам пад час яе правядзення. Аўтары ў сваіх работах выкарыстоўваюць лічбавы матэрыял дарэвалюцыйных даследчыкаў без прыцягнення дадзеных, якія ўтрымоўваліся ва ўстаўных граматах і выкупных актах.

У 1958 г. выйшла манаграфія М.Б. Фрыдман, прысвечаная адмене прыгоннага права ў Беларусі [7]. У ёй разглядаюцца сацыяльна-эканамічныя і палітычныя перадумовы адмены прыгону, падрыхтоўка сялянскай рэформы, аналізуюцца "Палажэнні 19 лютага" і іх рэалізацыя. М.Б. Фрыдман сцвярджае, што Беларусь напярэдадні адмены прыгону стаяла на вельмі нізкім узроўні эканамічнага развіцця. Асабліва ў бядотным становішчы знаходзілася сельская гаспадарка краю. Аўтар заўважае розніцу паміж рэгіёнамі Беларусі, але грунтоўнага аналізу гэтаму не дае. Адсюль вынікае, што ўкараненне новых сістэм земляробства, шырокае прымяненне наёмнай працы, развіццё таварна-грошавых адносін, выкарыстанне машын і г.д. насіла ва ўсёй Беларусі на пярэдадні рэформы выпадковы характар і закранула толькі некаторых буйных памешчыкаў.

Вялікі ўклад у вывучэнне сялянскай рэформы 1861 г. у Беларусі і ў першую чаргу ў высвятленне прычын адмены прыгоннага права ўнёс М.М. Улашчык. У сваім артыкуле "Крепостная деревня Литвы и Западной Белоруссии накануне реформы 1861 года" даследчык звярнуў увагу на значную розніцу ў эканамічным развіцці паміж заходнім і ўсходнім рэгіёнамі Беларусі. М.М. Улашчык пісаў: "У Літве і Заходняй Беларусі парэформенных гадоў былі падарваны ўсе асноўныя ўстоі феадальна-прыгоннай сістэмы:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гаспадарка хутка пераўтваралася з натуральнай у таварна-грашовую, значная маса сялян была пазбаўлена ўсіх сродкаў вытворчасці, тэхніка гаспадаркі рабіла значныя поспехі, уласная залежнасць вярхушкі сялян ад улады памешчыкаў моцна саслабела" [8]. Пазней гісторык развівае гэтую думку ў сваіх працах [9], звяртаючы ўвагу на тое, што ў заходніх губернях працэсу пераходу ад натуральнай гаспадаркі да таварна-грашовай спрыялі наяўнасць вялікай колькасці спажываючага насельніцтва і блізкасць да балтыйскіх партоў. М.М. Улашчык даказвае, што мясцовыя памешчыкі сталі пераводзіць у грошы шэраг натуральных павіннасцяў, уцягваючы гэтым сялян у рынкавыя адносіны. Прыгоннікі актыўна ліквідуюць цераспалоцу і імкнуцца атрымаць права неабмежаванага распараджэння ўсёй зямлёй маёнтка. Гэта было важнай абставінай, якая прымусіла памешчыка паставіць пытанне аб пераводзе павіннасцяў на чынш, а пасля і аб наданні свабоды сялянам.

Пытанні рэалізацыі рэформы 1861 г., памераў сялянскага і памешчыцкага землекарыстання, сервітутаў у паслярэформенны перыяд даследваліся В.А. Мілаванавым, М.Б.Фрыдман, М.Ф. Шпакавым, А.Р. Палонскім, Н.Л. Рабцэвіч, В.А. Хілютай [10].

Асобныя аспекты палітыкі царызму ў адносінах да сялянства як напярэдадні, так і пасля рэформы, асвятляюцца ў працах А.К Кажушкова, В.У. Чапко, Л.П. Ліпінскага, С.М. Самбук, Х.Ю. Бейлькіна [11].

Вывучэнню ўмоў вызвалення сялян ад прыгону і паслярэформеннага развіцця беларускай вёскі прысвяціў свае працы В.П. Панюціч [12].

Значнай падзеяй у вывучэнні сялянскай рэформы 1861 г. стаў выхад двух тамоў "Гісторыі сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён" (Т.1. 1997; Т. 2. 2002.). У гэтых фундаментальных працах на аснове вялікай колькасці разнастайных архіўных і друкаваных крыніц і абагульнення спецыяльнай літаратуры грунтоўна вывучаецца большасць аспектаў сялянскай рэформы 1861 г. у Беларусі.

Такім чынам, з пачатку XIX ст. і па сённяшні дзень беларускія гісторыкі даследавалі розныя аспекты адной з найважнейшых падзей гісторыі Беларусі – адмены прыгоннага права. Шмат зроблена і напісана за ўвесь гэты час. Нельга ахапіць усе пытанні, што датычаць сялянскай рэформы 1861 г., якія ўжо падняты беларускімі даследчыкамі. Аднак нават тыя, пра якія ішла гаворка, сведчаць аб сурёзным падыходзе беларускаўй гістарычнай навукі да важнейшых праблем гісторыі Беларусі XIX ст.

Літаратура:

1. Ігнатоўскі У.М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. 5-е выд. Мн., 1991; Ён жа. Гісторыя Беларусі ў XIX і ў пачатку XX ст.: Лекцыі, чытаныя студэнтам БДУ. 3-е выд. Мн., 1928; Ён жа. Да пастаноўкі пытання аб паўстанні 1863 г. // Бальшавік Беларусі. 1928. № 6-7; Ён жа. 1863 г. на Беларусі. Мн., 1930.
2. Довнар-Запольский М.В. Народное хозяйство Белоруссии 1861-1914 гг. Мн., 1926; Ён жа. История Белоруссии. Мн., 2003.
3. Мялешка М.В. Паншчына на Беларусі (Гісторыка-этнаграфічны нарыс з жыцця сялян Міншчыны за прыгонам 1826-1857 гг.). // Полымя. 1924. № 4. С. 106-129; 1925. № 4. С. 97-116; 1926. № 4. С. 117-121; Шлюбскі А. Паны і сяляне ў першай палове XIX ст. Мн., 1924; Жариков Д. Крестьянская дифференциация перед падением крепостного права. // Працы БДУ.1925. № 6-7. С. 259-282; Ён жа. Прыгонная гаспадарка Беларусі паводле даных расійскай гаспадарчай літаратуры і журналістыкі 30-40-х гадоў. // Полымя. 1928. № 8. С. 98-117; № 9. С. 136-150.
4. Кернажыцкі К.У. Гаспадарка прыгоннікаў на Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Да праблемы разлажэння феадалізму ў Беларусі. Мн., 1935; Пичета В.И Основные моменты исторического развития Западной Украины и Западной Белоруссии. М., 1940.
5. Лочмель І. Адмена прыгоннага права на Беларусі ў 1861. // Бальшавік Беларусі. 1939. № 5. С. 88.
6. Фридман М.Б. Крестьянская реформа 1861 г. в Минской губернии. Дис. канд. ист. наук. Мн., 1947; Полонский А.В. Крестьянская реформа 1861 г. в Гродненской губернии. Дис. канд. ист. наук. Мн., 1949; Короткевич А.Т. Отмена крепостного права в Витебской губернии. Дис. канд. ист. наук. Мн., 1954; Лысенко М.Г. Кризис крепостного хозяйства и реформа 1861 г. в Могилевской губернии. Дис. канд. ист. наук. Мн., 1955.
7. Фридман М.Б. Отмена крепостного права в Белоруссии. Мн., 1958.
8. Улащик Н.Н. Крепостная деревня Литвы и Западной Белоруссии накануне реформы 1861 года. // Вопросы истории. 1948. № 12. С. 66.
9. Ён жа. Орудия производства и системы земледелия в помещичьем хозяйстве Литвы и Западной Белоруссии в период разложения феодально-крепостнического строя. // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы. 1959 г. М., 1961; Ён жа. Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии. М., 1965 і інш.
10. Мілаванаў В.А. Змяненне зямельных надзелаў сялян Беларусі, Літвы і Правабярэжнай Украіны ў выніку рэформы 1861 г. // Весці АН БССР: Сер.грамад.навук. 1962. № 2. С. 122-134; Фридман М.Б. Реализация реформы 1861 г. в Минской губернии. // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы. 1962 г. Мн., 1964. С. 442-454; Шпаков М.Ф. Реализация реформы 1861 г. в Могилевской губернии. Там жа. С. 559-571; Полонский А.В. "Крестьянская" реформа и сервитуты в поземельных отношениях в Белоруссии. // Вопросы истории: Сб. науч. трудов. Минского пед. ин-та. Мн., 1973. Т 4. вып. 1; Рябцэвич А.Л. Разверстание сервитутов в Минской губернии. // Из истории крестьянства Бело-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

руссии. Мн., 1978; Хилюта В.А. Землепользование и землевладение бывших помещичьих крестьян Гродненской губернии в середине XIX века (40-е – начало 70-х гг.). Автореф. дис. канд. ист. наук. Мн., 1952
11. Кожушков А.И. Развитие капитализма в сельском хозяйсте Белоруссии во второй половине XIX в. Мн., 1963; Чепко В.В. Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX в. Мн., 1966; Липинский Л.П. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии: (II половина XIX в.). Мн., 1971; Самбук С.М. Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX века. Мн., 1980; Бейлькин Х.Ю. Сельскохозяйственный рынок в Белоруссии 1861-1914 гг. Мн., 1989.
12. Панютич В.П. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1961-1900 г. Мн., 1990; Ён жа. Абеззямельванне сялян Беларусі перад адменай прыгону (40-50-я гг. XIX ст.) // Весці АН Беларусі. Сер. Гуманіт. Навук. 1995. № 4; Ён жа. Наёмный труд в сельском хозяйстве Белоруссии 1861-1914 гг. Мн., 1996. і інш.

К ВОПРОСУ ИСТОРИОГРАФИИ СОЦИАЛЬНО-ЭКОНОМИЧЕСКОГО ПОЛОЖЕНИЯ ЖЕЛЕЗНОДОРОЖНИКОВ БЕЛАРУСИ ПЕРИОДА КАПИТАЛИЗМА.

П.А. Тупик
г. Минск

В досоветской историографии, исследовавшей развитие железнодорожного хозяйства, обсуждались вопросы строительства новых железных дорог, повышения их технической оснащенности, подготовки квалифицированных кадров рабочих и служащих для железнодорожного транспорта [1]. В ряде публикаций досоветского периода имеется ценный фактический материал по отдельным вопросам численности и состава, экономического положения железнодорожников и правительственной политики в этой сфере [2]. Большинство авторов, показывая тяжелое экономическое положение низших железнодорожных служащих, вопиющие факты их бесправия, ограничились констатацией этих фактов [3]. Практически никто из них не обратил внимания на положение железнодорожных рабочих. Особо следует отметить работу В.Дмитриева [4]. Анализируя быт и условия труда железнодорожников, автор пришел к выводу, что улучшение экономического положения железнодорожников в начале XX в. было прямо связано с влиянием первой российской революции, в которой они приняли активное участие. В целом работы досоветских исследователей, посвященные проблемам железнодорожного транспорта России, носили описательный характер.

Не утратили ценности в ряде отношений работы исследователей 20-х годов прошлого века. К.А. Пажитнов предпринял попытку решить целый ряд вопросов, связанных с составом и экономическим положением железнодорожников. Однако автор рассматривал железнодорожников как социально однородную массу, заработную плату определил без учета категорий и профессий, оставил в стороне вопрос о продолжительности рабочего дня рабочих мастерских и депо [5].

Проблемам положения железнодорожников накануне революции 1905-1907 гг. посвящена отдельная глава в работе Н.Ростова [6]. Автор выясняет уровень номинальной и реальной заработной платы, продолжительность рабочего времени, вопросы медицинского обслуживания и текучести кадров. Однако из-за ограниченности источниковой базы исследователь занизил уровень и номинальной, и реальной заработной платы. Фактический материал, приведенный в этой работе, имеет в значительной степени иллюстративный характер.

Анализ состава и положения железнодорожников содержится в работах И.М. Пушкаревой [7]. Она впервые использовала «Ведомости штатного содержания, квартирного довольствия и лично присвоенного содержания служащих казенных железных дорог на 1905 г.», дополнив их данными железнодорожной статистики и архивными материалами, разработала сводные таблицы, дающие представление о размере заработной платы всех категорий рабочих и служащих. Большой интерес вызывает удачная, на наш взгляд, попытка определения на 1905 г. социальной стрктуры железнодорожников, на основе разработанной автором методики. В то же время остались в стороне такие важные показатели экономического положения как степень эксплуатации, жилищные условия, годовой рабочий период, сверхурочный труд. Некоторые важные положения автора (о формировании постоянных кадров железнодорожников, о незначительной степени их связи с землей) не подтверждены фактами.

Значительный вклад в изучение положения рабочего класса России, в том числе и железнодорожников, в рассматриваемый период внесли труды Э.Э.Крузе [8]. Наряду с выяснением номинальной и реальной заработной платы, длительности рабочего дня, она определила продолжительность рабочего года для металлистов, в состав которых входили и рабочие железнодорожных мастерских и депо. Не получили освещения такие важные вопросы, как изменения в источниках пополнения, образования, медицинское обслуживание и социальное обеспечение железнодорожников.

Вопросы состава и положения железнодорожников в белорусской историографии разработаны недостаточно. Отдельные сведения по этим вопросам имеются в коллективном труде о развитии экономики Беларуси в 1900-1917 гг. [9], в работах З.Е. Абезгауза [10], А.И. Вороновой [11] и др. Их метод определения численности железнодорожников на территории

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ